ся даваць абарону сваіх інтарэсаў у судзе не толькі штатнаму адвакату, але і паверанаму з афармленай у адпаведнасці з законам даверанасцю. Па ўказе ад 20 лютага 1822 г. асобам, якія не мелі грошай для аплаты адвакацкіх паслуг, прадстаўляліся адвакаты без платы з ліку штатных супрацоўнікаў[1].

Паражэнне паўстання 1830–1831 гг. прывяло да ліквідацыі інстытута адвакатуры разам са скасаваннем дзеяння III Статута ВКЛ і ўніфікацыяй судаўладкавання і судаводства на тэрыторыі беларускіх губерняў.

Такім чынам, у канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі была створана груваздкая, шматузроўневая судовая сістэма, структурныя элементы якой дубліравалі функцыі тых ці іншых судовых устаноў, што абцяжарвала разгляд спраў. Акрамя гэтага, фарміраванне судовых органаў адбывалася на саслоўнай аснове, што стрымлівала працэс складвання грамадзянскай супольнасці. Скасаванне прыгоннага права, правядзенне іншых рэформ на буржуазнай аснове патрабавалі карэннага рэфармавання судовай сістэмы ў інтарэсах як дзяржавы, так і ўсяго насельніцтва незалежна ад класавай ці саслоўнай прыналежнасці.

## 7.2. Асаблівасці рэалізацыі судовай рэформы 1864 г. у Беларусі

*(І. Г. Гушчынскі)*

Падпісанне імператарам Аляксандрам II 20 лістапада 1864 г. судовых статутаў («Учреждение судебных установлений», «Устав уголовного судопроизводства», «Устав гражданского судопроизводства», «Устав о наказаниях, налагаемых мировыми судьями») далі пачатак рэалізацыі ў Расійскай імперыі судовай рэформы[2]. Пазней яна была дапоўнена зацверджаным 14 красавіка 1866 г. «Положением о нотариальной части»[3]. Трэба адзначыць, што практычныя крокі ў кірунку рэфармавання судовай сістэмы імперыі былі зроблены яшчэ раней. Так, у 1860 г. быў уведзены інстытут судовых следчых, у выніку чаго следчыя справы ад па-

[1] ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 38 (1822–1823). – № 28936.– С. 86.

[2] ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 39 (1864). – Отд. 2. – № 41475. – С. 180–215; № 41476. – С. 215–306; № 41477. – С. 306–401; № 41478. – С. 401–418.

[3] ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 41 (1866). – Отд. 1. – № 43186. – С. 346–362.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ліцыі пераходзілі ў кампетэнцыю судовых органаў[1], а ў 1863 г. былі адменены найбольш цяжкія цялесныя пакаранні (кляймене, шпіцрутэны і г. д.)[2].

Судовая рэформа 1864 г. па праве лічыцца самай паслядоўнай па сваёй накіраванасці на фарміраванне грамадзянскай супольнасці з усіх рэформ 60–70-х гг. XIX ст. Судовыя статуты абвясцілі шэраг буржуазна-дэмакратычных прынцыпаў судаўладкавання і судаводства: усесаслоўнасць, абасабленне суда ад адміністрацыі, нязменнасць суддзяў, выбарнасць часткі судовых асоб, а таксама галоснасць, вуснасць і спаборнасць, у сувязі з чым была рэарганізавана пракуратура і заснавана адвакатура.

Згодна з рэформай ствараліся дзве галіны судовай сістэмы: мясцовая і агульная. Да мясцовай належалі міравыя суды і з'езды міравых суддзяў – у якасці апеляцыйнай інстанцыі. Да галіны агульных судоў адносіліся акруговыя суды (ад аднаго да трох на губерню), судовыя палаты (адна на некалькі губерняў), якія былі другой (апеляцыйнай) інстанцыяй для падачы скарг на рашэнні акруговых судоў, а таксама першай інстанцыяй для вырашэння найбольш важных крымінальных спраў (напрыклад, аб дзяржаўных злачынствах). Вышэйшай касацыйнай інстанцыяй з'яўляліся адпаведныя дэпартаменты Сената. У той жа час значная колькасць спраў засталася па-за межамі юрысдыкцыі названых судовых органаў і разглядалася сялянскімі (валаснымі), вайсковымі, духоўнымі і некаторымі іншымі судамі, непадведамаснымі Міністэрству юстыцыі.

Аднак хутка стала зразумела, што новы суд супярэчыць самой сутнасці самадзяржаўна-бюракратычнаму ладу Расіі. Прымяненне судовых статутаў, у тым ліку на палітычных працэсах 1870-х гг. над рэвалюцыйнымі народнікамі, паказала, што яны непрыдатны для барацьбы з рэвалюцыйным рухам. Больш таго, ва ўрадавых колах умацоўвалася меркаванне, што абасабленне суда ад выканаўчай улады, нязменнасць і незалежнасць суддзяў, суд прысяжных, незалежная ад адміністрацыі адвакатура, галоснасць і спаборнасць судаводства, выбарны міравы суд – усё гэта ўвогуле разбурае асновы

[1] ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 35 (1860). – Отд. 1. – № 35890. – С. 710–715; № 35891. – С. 715–725.

[2] ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 38 (1863). – Отд. 1. – № 39504. – С. 352–353; № 39505. – С. 353–354; Отд. 2. – № 40205. – С. 160–161.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ